# КАШТОЎНАСЦІ, МЭТЫ І НОРМЫ ШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ Ў ГЕРМАНІІ

***У. І. АНДРЭЕЎ,***
***загадчык лабараторыі параўнальнай адукацыі***
***Нацыянальнага інстытута адукацыі,***
***М. Ф. АРСЕНЦЬЕВА,***
***аспірантка лабараторыі***

Карэнныя змены функцыі адукацыі на мяжы двух стагоддзяў суправаджаюцца зменамі ў аксіялогіі (тэорыі каштоўнасцей) і тэлеалогіі (здольнасці да мэтавызначэння) школьнай адукацыі ў Германіі.

Па-ранейшаму актуальнымі ў навучанні і выхаванні падрастаючай змены з'яўляюцца такія каштоўнасці, як свабода, дэмакратычнасць, права на жыццё, свабоднае развіццё асобы, самарэалізацыя, самаідэнтыфікацыя, палітычны і светапоглядны плюралізм, талерантнасць. Гэтым, вядома ж, не вычэрпваюцца каштоўнасці, да якіх павінна імкнуцца адукацыя ў сучаснай школе.

Мэты выхавання ў нямецкай школе разглядаюцца педагогамі краіны як трацічныя ў трыядзе: асноўныя каштоўнасці — нормы — выхаваўчыя каштоўнасці.

Каштоўнасці фіксуюць тое, што ўжо склалася ў жыцці народа, у яго менталітэце і абвешчана як норма. Рашаючай прыкметай каштоўнасці, на думку нямецкіх педагогаў, з'яўляецца акт ацэньвання, які азначае канчатковае прыманне нормы, а затым і мэты выхавання індывідуума (König E. Werte und Normen in der Erziehung // Roth L. (Hg.) Pädagogik. München, 1991).

Нормы, што следуюць за каштоўнасцямі ў выглядзе неабходных установак, перакананняў, якія ўсталяваліся з часам і распаўсюдзіліся на значны культурны пласт (напрыклад, правы чалавека, дзесяць запаведзей Старога запавету, праўдзівасць і да т. п.), лічацца агульнымі патрабаваннямі, выкананне якіх абавязковае для ўсіх не толькі ў канкрэтнай сітуацыі, але і

ў паўсядзённым жыцці. Нормы з'яўляюцца прагматычнай формай каштоўнасцей (Там жа).

На думку нямецкіх педагогаў, мэты і нормы выхавання блізкія адна да адной. Мэты ставяцца аўтарытарнай асобай ці ўладамі. Менавіта яны вызначаюць ідэал выхавання (навучання) і прапануюць адпаведныя яму дзеянні настаўніка (выхавальніка) па рэалізацыі на практыцы такога ідэалу (Brezinka W. Erziehungsziele, Erziehungsmittel, Erziehungserfolg. München, 1975. S. 155).

Як жа рэалізуецца гэта трыяда на практыцы і ў навуковых даследаваннях нямецкіх педагогаў?

Звернемся спачатку да матэрыялаў 24 Кангрэса (Abstracts — ATEE — 24th annual conference. Universität Leipzig. 30. August-05. September 1999) па праблемах педагагічнай адукацыі, які адбыўся 30. 08—5.09.1999 г. у Лейпцыгскім універсітэце. Многія ўдзельнікі яго звярталіся да ідэй І. Гербарта, Я. Каменскага, А. Дыстэрвега аб выхаванні школьнікаў на такіх каштоўнасцях, як парадак, працавітасць, дысцыплінаванасць на ўроках, паслушэнства, павага да старэйшых, руплівасць і інш. Гэта звязана ў асноўным з частымі выпадкамі парушэння дысцыпліны, ростам наркаманіі, ужывання спіртных напіткаў, хуліганства, насілля ў сучаснай школе. Прыярытэтнымі называліся каштоўнасці абавязку і пераканання, а таксама захавання адзінства мэт у навучальна-выхаваўчым працэсе; пераемнасць у перадачы каштоўнасцей паміж пакаленнямі; улік менталітэту школьнікаў. Падкрэслівалася, што залішняе завышэнне каштоўнасцей «другога парадку» (матэрыяльных) як суб'ектыўна значымых для любога індывіда прыводзіць да супярэчнасцей паміж пакаленнямі бацькоў і дзяцей. Гэта асабліва відавочна ў школах усходніх зямель Германіі.

Даследчыкі праблем маралі і маральнасці А. Ліне, Х. Маер і іншыя шмат увагі ўдзялялі пытанням маралі як грамадскай каштоўнасці ў выхаванні школьнікаў.

Абагульняючы матэрыялы кангрэса і іншыя даследаванні, можна канстатаваць, што механізм выхавання вучнёўскай моладзі на каштоўнасцях грамадства ў нямецкай школе прадугледжвае наступнае:

прывядзенне дзяцей і падлеткаў у стан свядомага выбару каштоўнасцей ва ўмовах пастаяннай канфрантацыі каштоўнасных канфліктаў;

прыняцце стратэгічных рашэнняў праз выбар супрацьлеглых каштоўнасцей і наступная пабудова рэальнай карціны свету як структуры норм і ўзаемадзеяння каштоўнасцей;



выхаванне на дабрачыннасці ў ходзе навучальна-выхаваўчага працэсу;

супрацоўніцтва настаўнікаў з выхаванцамі, а не навязванне апошнім тых ці іншых каштоўнасцей.

Вынікі сацыялагічных апытанняў 5109 школьнікаў і іх бацькоў у 1994 г. і 6089 рэспандэнтаў у 1998 г. Інстытутам вывучэння грамадскай думкі ў Аленсбаху і Гамбургу даюць наступны малюнак іх адносін да адукацыі ў школе (Rheinischer Merkur. № 13, 26.03.1999. S. 9). На пытанне анкеты «Што важней: падрыхтоўка школьнікаў да прафесіянальнай дзейнасці ці атрыманне глыбокіх агульнаадукацыйных ведаў?» атрыманы наступныя адказы:

1. Атрыманне глыбокіх агульнаадукацыйных ведаў — 55 % па апытаннях 1994 г., у тым ліку 59 % — ва ўсходніх землях, 54 % — у заходніх землях; 48 % па апытаннях 1998 г., у тым ліку 48 % — ва ўсходніх землях, 48 % — у заходніх землях.

2. Падрыхтоўка школьнікаў да прафесіянальнага навучання — 24 % па выніках апытання 1994 г., у тым ліку 26 % у заходніх землях і 17 % — ва ўсходніх землях; 37 % па выніках апытання 1998 г., у тым ліку 37 % — у заходніх землях і 36 % — ва ўсходніх землях.

На пытанне анкеты «Ці атрымліваюць школьнікі веды, патрэбныя для жыцця, або вы сумняваецеся ў гэтым?» атрыманы наступныя адказы:

65 % рэспандэнтаў упэўнены ў карыснасці атрымліваемых у школе ведаў па выніках апытання 1994 г., у тым ліку 66 % — у заходніх землях і 63 % — ва ўсходніх землях; 66 % па выніках апытання 1998 г., у тым ліку 67 % — у заходніх землях і 61 % — ва ўсходніх землях.

78 % апытаных лічаць, што школа павінна даваць моладзі не толькі веды, але і выхоўваць яе на наступных дабрачыннасцях: талерантнасці, ветлівасці, стараннасці, здольнасці ўспрымаць крытыку і карпаратыўнасці духу.

Сярод школьных дысцыплін, што ўплываюць на фарміраванне названых каштоўнасцей, перавага аддаецца нямецкай мове. Менавіта так лічаць 73 % рэспандэнтаў. На другое месца па важнасці апытаныя паставілі замежныя мовы — 53%. Астатнія школьныя дысцыпліны яны размеркавалі наступным чынам: матэматыка — 38 %, прыродазнаўчыя навукі — 24 %, эканамічныя навукі — 15 %, рэлігія — 8 %.

Нямецкая школьная канцэпцыя выхавання моладзі на каштоўнасцях зыходзіць з таго, што ў плюралістычным грамадстве яны не могуць быць упарадкаванымі. Задача школы заключа-

ецца ў тым, каб падрыхтаваць вучняў да свядомага выбару каштоўнасцей. Прычым яны павінны самі прымаць адпаведныя рашэнні, зыходзячы з супрацьпастаўлення каштоўнасцей у рэальнай школьнай сітуацыі. У сувязі з гэтым нямецкія педагогі ўсё часцей звяртаюцца да ідэй І. Гербарта аб выхаваўчым навучанні. З мэтай забеспячэння каштоўнаснага выхавання бацькі ўсё часцей аддаюць сваіх дзяцей у альтэрнатыўныя школы. Характэрны ў гэтых адносінах вопыт работы Йенскай школы зямлі Брандэнбурга (Susanne Spahn. Schüler uber ihre Lehrer // Der Lehrer in der Epoche gesellschaftlicher Veränderungen. Universität Potsdam. Yuli 1999. S. 131—148).

У жыццядзейнасці названай школы прыярытэтнае месца займае сацыяльны аспект адносін паміж вучнямі і настаўнікамі як каштоўнасць і норма адносін выхаванцаў між сабой і з педагогамі, дапамога старэйшых школьнікаў малодшым у змешаных навучальных групах, узаемадапамога рабят аднаго ўзросту. У дадзенай школе, як і ў іншых альтэрнатыўных школах Германіі, сацыяльная гуманная кампетэнцыя як норма дамінуе над дыдактычнай кампетэнцыяй настаўніка. 80 % з ліку апытаных выпускнікоў, перайшоўшы пасля шасці гадоў навучання ў сёмы клас звычайнай школы, лічаць, што ў ёй настаўнікі не вельмі гуманныя, не заўсёды знаходзяць узаемаразуменне з выхаванцамі, не ўстанаўліваюць з імі асабістых кантактаў, рэдка прыходзяць на дапамогу слабапаспяваючым вучням.

Вынікі даследавання паказалі, што калі настаўнік не рэалізуе на практыцы сацыяльную і гуманную кампетэнцыі, дык не можа быць і размовы аб выхаванні школьнікаў на тых ці іншых дзяржаўных і асабістых каштоўнасцях. Гэта ж думка пацвярджаецца і рэпрэзентацыйнымі даследаваннямі М. Кандэрса, Е. Рознера, Х.-Г. Рольфа (Kanders M., Rösner E., Rolff H.-G. Das Bild der Schule aus der Sicht von Schülern und Lehrern. Ergebnisse zweier IFS-Repräsentativbefragungen. Jahrbuch der Schulentwicklung. Bd. 9. Juwenta Verlag, Weinheim, München, 1996), якія даследавалі ўзаемаадносіны школьнікаў і настаўнікаў у асноўнай (9 класаў), рэальнай (10—11 класаў) школах і гімназіі (13 класаў). Яны прыйшлі да вываду, што толькі пастаяннае ўзаемадзеянне вучня і настаўніка, засваенне апошнім педагагічнай антрапалогіі дае магчымасць рэалізаваць на практыцы мэты і нормы, заснаваныя на нацыянальных каштоўнасцях і агульначалавечых дабрачыннасцях.

Шэраг нямецкіх педагогаў тлумачыць складанасць выхавання школьнікаў на каштоўнасцях гуманізму такімі пазаадукацыйнымі фактарамі, што лёгка накладваюцца і на нашу беларускую рэчаіснасць, як распад сем'яў і пагаршэнне сямейнага выхавання; перакладванне бацькамі-адзіночкамі часткі сваіх абавязкаў на дзяцей; набыццё школьнікамі з поўных сем'яў адмоўнага вопыту дзяцей-сірот; псіхасаматычныя парушэнні ў дзяцей з няўдалых сем'яў; злоўжыванне дзецьмі часам для прагляду тэлеперадач (да 9 гадзін у будзённы дзень вучнямі пачатковай школы і да 15 гадзін — у святочныя дні), якія нярэдка даюць скажоныя ўяўленні аб маральных каштоўнасцях з нерэальнага віртуальнага свету; адсутнасць стараннасці ў вучобе; нізкая канцэнтрацыя дзяцей з-за захворванняў у выніку забруджання навакольнага асяроддзя ці няправільнага харчавання.

Такім чынам, аналіз поглядаў нямецкіх педагогаў на каштоўнасці, мэты і нормы школьнай адукацыі выклікае неабходнасць адапціраваць навучанне і выхаванне да новых умоў. Спектр мэты і норм адукацыі ў нямецкай школе грунтуецца на ўзаемасувязі фундаментальных каштоўнасцей свабоды, палітычнай дэмакратыі, розуму (рацыянальнасці), этыкі, экалогіі, мастацтва, валеалогіі (здароўя і здаровага ладу жыцця).